Адміністрацыя Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь
**Галоўнае ўпраўленне па рабоце
са зваротамі грамадзян
і юрыдычных асоб**
220016, г. Мінск, рэзідэнцыя Прэзідэнта,
тэл. 222-26-15, факс 226-06-10
www: president.gov.by

Администрация Президента
Республики Беларусь
**Главное управление по работе
с обращениями граждан
и юридических лиц**
220016, г. Минск, резиденция Президента,
тел. 222-26-15, факс 226-06-10
www: president.gov.by

11.08.2023 № 15/16012300000615

Ваш электронны зварот, які паступіў у Адміністрацыю Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, даложаны кіраўніцтву Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Выказваем удзячнасць за актыўную жыццёвую пазіцыю і беражлівае стаўленне да гісторыі нашай краіны. Наконт узнятых Вамі пытанняў паведамляем наступнае.

У Рэспубліцы Беларусь асаблівае стаўленне да подзвігу савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Ад рук фашысцкіх акупантаў наша краіна страціла каля трэці насельніцтва, бяда зайшла ў кожны дом. Сотні спаленых вёсак з іх жыхарамі, канцэнтрацыйныя лагеры смерці, беззапаветны подзвіг абаронцаў Брэсцкай крэпасці, байцоў Чырвонай арміі, партызан, падпольшчыкаў і мірнага насельніцтва назаўжды застануцца ў памяці беларускага народа.

Згодна з Законам Рэспублікі Беларусь ”О государственных наградах Республики Беларусь“ званне ”Герой Беларусі“ з’яўляецца найвышэйшай ступенню адрознення Рэспублікі Беларусь і прысвойваецца за выключныя заслугі перад дзяржавай і грамадствам, звязаныя з подзвігам у імя свабоды і працвітання Беларусі.

Узнагароджанне пасмяротна за подзвігі, якія здзейснены да абвяшчэння незалежнасці беларускай дзяржавы, у тым ліку ў гады Вялікай Айчыннай вайны, Законам Рэспублікі Беларусь не прадугледжана. У сувязі з гэтым законныя падставы для прысваення З.Р.Калабанаву звання ”Герой Беларусі“ адсутнічаюць.

Адначасова паведамляем, што парадак прадстаўлення да ўзнагароджання дзяржаўнымі ўзнагародамі Расійскай Федэрацыі рэгулюецца расійскім заканадаўствам. Так, згодна з пунктам 36

Палажэння аб дзяржаўных узнагародах Расійскай Федэрацыі, зацверджанага Указам Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі ад 7 верасня 2010 г. № 1099, прадстаўленне да ўзнагароджання дзяржаўнымі ўзнагародамі за воінскія подзвігі або іншыя заслугі, што мелі месца да 31 снежня 1991 г., уносіцца Прэзідэнту Расійскай Федэрацыі на падставе захаваных у архівах узнагародных лістоў, якія былі афармлены і ўзгоднены ў адпаведнасці з патрабаваннямі заканадаўства таго перыяду, але рашэнне па якіх не было прынята.

У частцы стварэння кінастужкі Ваш зварот для разгляду накіраваны ў Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь і Нацыянальную акадэмію навук Беларусі з даручэннем інфармаваць аб выніках Вас і Адміністрацыю Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Першы намеснік начальніка
галоўнага ўпраўлення па рабоце
са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб І.А.Ламаносаў